Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 4. С. 24–28

УДК 94: 331.105 (476)

# АДНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ КАЛЕКТЫЎНА-ДАГАВОРНАЙ РАБОТЫ Ў БССР (КАНЕЦ 40-х – 60-я гг. ХХ ст.)

**А. А. Дубовік,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі*
*беларускай дзяржаўнасці БНТУ*

Паступіў у рэдакцыю 21.09.20.

UDC 94: 331.105 (476)

# RENEWING AND DEVELOPING OF COLLECTIVE-CONTRACT WORK IN BSSR (LATE 40s – 60s OF THE 20th CENTURY)

**A. Dubovik,**
*PhD in History, Associate Professor of the*
*Department of History of Belarusian Statehood,*
*Belarusian National Technical University*

Received on 21.09.20.

Аднаўленне ў другой палове 1940-х гг. і далейшае развіццё ў 1950–1960-х гг. калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін мела важнае значэнне для павышэння актыўнасці працоўных мас і ролі прафсаюзаў, вырашэння сацыяльных пытанняў. Аднак у калектыўна-дагаворнай рабоце было шмат фармалізму. Дагаворная сутнасць і рэгулятыўнае значэнне калектыўных дагавораў у сферы працоўных адносін, што мела месца ў час НЭПа, былі згублены. Спробы ажывіць калектыўна-дагаворную справу прымаліся ў час касыгінскай эканамічнай рэформы, калі ў сакавіку 1966 г. быў адноўлены нарматыўна-прававы статус калдагавораў. Аднак калектыўна-дагаворная практыка ў СССР мела шэраг асаблівасцей. Перш за ўсё, наймальнікі і працаўнікі выступалі не як бакі сацыяльнага партнёрства са сваімі інтарэсамі, а як прадстаўнікі аднаго калектыву, якія вырашалі аднолькавыя задачы. Па сутнасці калектыўны дагавор уяўляў сабой план сумесных дзеянняў адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта па паляпшэнні ўмоў і аховы працы, рашэнні іншых сацыяльных пытанняў на прадпрыемстве.

*Ключавыя словы:* БССР, працоўныя адносіны, калектыўны дагавор, калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін, прафсаюзы, сацыяльнае партнёрства.

Renewing in the second half of the 1940s and further development in the 1950-1960s of collective-contract regulation of labor relations had an important meaning for increasing the activity of working people and the role of trade unions, solving social problems. However, the collective-contract work had a lot of formality. Contract essence and regulation meaning of collective contracts in the sphere of labor relations in the time of NEP were lost. The attempts to revive the collective-contract system were made in the time of Kosygin's economic reform, in March 1966 the normative legal status of collective contracts was renewed. But the collective-contract practice in USSR had a range of peculiarities. First of all employers and employees were presented not as the sides of social partnership with their interests but as representatives of one team who solve the same problems. In its essence a collective contract represented a plan of joint activity of the administration and trade union committee on improving the conditions and labor protecting, solving other social issues on the enterprise.

*Keywords:* BSSR, labor relations, collective contract, collective-contract regulation of labor relations, trade unions, social partnership.

*Уводзіны.* Эфектыўнай формай удзелу працоўных калектываў у кіраванні прадпрыемствамі, дзейсным інструментам абароны прафсаюзнымі арганізацыямі правоў і законных інтарэсаў працуючых выступае калектыўны дагавор. Станаўленне калектыўных дагавораў, змена іх зместу і ролі адбывалася пад уплывам і з'яўлялася адлюстраваннем сацыяльна-эканамічнай палітыкі дзяржавы. Вялікую цікавасць уяўляе вывучэнне гісторыі развіцця калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін у Беларусі. Гэтая праблема не была прадметам спецыяльнага навуковага даследавання, а ў агульнай літаратуры па гісторыі прафсаюзнага руху Беларусі ёсць нестыкоўкі і недакладнасці. Мэта артыкула – на аснове прыцягнення новых архіўных крыніц раскрыць працэс аднаўлення калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін у канцы 1940-х гг. і яго развіцця ў БССР у 1950–1960-я гг. з удзелам прафесійных саюзаў.

*Асноўная частка.* Калектыўна-дагаворнае рэгуляванне працоўных адносін атрымала распаўсюджанне ў Савецкай Беларусі ў гады НЭПа. Ахоп працуючых калектыўнымі дагаворамі ў другой палове 1920-х гг. дасягаў 70 %. Шырокі маштаб прымала абмеркаванне праектаў калектыўных дагавораў, удзел у ім рабочых і служачых [1].

Аднак у 1933 г. было праведзена апошняе масавае перазаключэнне калектыўных дагавораў [2]. Пачынаючы з 1934 г., калектыўныя

дагаворы ў БССР і ў СССР у цэлым наогул не заключаліся, што стала вынікам зацвярджэння ў краіне каманднa-адміністрацыйнай сістэмы, узмацнення планавых пачаткаў у эканоміцы і цэнтралізаванага рэгулявання заработнай платы [3]. Сваю ролю адыграла і падмена калектыўных дагавораў іншымі формамі сацыяльна-працоўных адносін. Вытворчыя нарады, часовыя кантрольныя камісіі і г. д. у пэўнай ступені замянілі калектыўна-дагаворны працэс у сферы вытворчасці.

Аднаўленне калектыўна-дагаворнай практыкі адбылося толькі пасля вайны. 4 лютага 1947 г. Савет Міністраў СССР адобрыў прапанову УсеЦСПС аб аднаўленні практыкі заключэння калектыўных дагавораў. Заключэнне калектыўнага дагавора ўскладалася на фабрычна-заводскі камітэт прафсаюза [4, с. 380, 381]. Заведзены парадак быў зафіксаваны ў красавіку 1949 г. у Статуце прафесійных саюзаў СССР [5, с. 13]. У адпаведнасці з рашэннем Прэзідыума УсеЦСПС ад 18 сакавіка 1947 г. у гэтым годзе калектыўныя дагаворы былі заключаны на прадпрыемствах прамысловасці, транспарту і будаўніцтва. З 1948 г. аднавілася заключэнне калектыўных дагавораў на прадпрыемствах і арганізацыях сувязі, у саўгасах і машына-трактарных станцыях, а з 1950 г. – на прадпрыемствах дзяржаўнага гандлю і грамадскага харчавання [6, с. 114]. Калектыўныя дагаворы заключаліся ў гэты перыяд толькі на ўзроўні прадпрыемстваў, іх прыняцце на ўзроўні галін народнай гаспадаркі ці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак не практыкавалася.

Аднак сэнс калектыўных дагавораў істотна змяніўся ў параўнанні з перыядам НЭПа. Зараз яны з’яўляліся ў большай ступені палітычным, чым юрыдычным абавязацельствам, галоўным чынам палітыка-ідэалагічным дакументам, сродкам мабілізацыі працоўных на выкананне і перавыкананне гаспадарчых планаў. У аснову калдагавораў закладваліся планавыя эканамічныя паказчыкі, у той жа час яўна недастаткова ўвагі надавалася сацыяльна-бытавым умовам працаўнікоў. Дагаворнаму рэгуляванню працоўных адносін практычна не адводзілася месца. У сувязі з гэтым сам калектыўна-дагаворны працэс набыў фармальны характар. Калектыўныя дагаворы, іншыя формы ўдзелу працоўных у кіраванні прадпрыемствамі насілі ў асноўным дэкаратыўны характар, вызначаліся высокай доляй фармалізму. Некаторыя расійскія вучоныя, напрыклад В. К. Пацёмкін, называюць падобную практыку псеўдапартнёрствам [7, с. 23].

Тым не менш, працоўныя Беларусі, як і ўсёй савецкай краіны, з належнай увагай адносіліся да калектыўна-дагаворнай работы. На сходах па заключэнні калектыўных дагавораў, як правіла, прысутнічала 85–90 % рабочых і служачых. Так, у 1947 г. на сходах пры абмеркаванні праектаў калектыўных дагавораў было ўнесена больш за 10 тыс. прапаноў, палова якіх датычылася паляпшэння арганізацыі і аховы працы, механізацыі працаёмкіх працэсаў [8, арк. 40; 9, арк. 145; 10, с. 301].

З кожным годам расла колькасць прадпрыемстваў рэспублікі, дзе заключаліся калектыўныя дагаворы. Калі ў 1947 г. іх было заключана толькі 889, то ў 1948 г. – 989, у 1949 г. – 1370 і ў 1950 г. – 1818 [6, с.114; 11, арк. 98].

У сувязі са штогадовым заключэннем калектыўных дагавароў на прадпрыемствах значна павысілася роля прафсаюзных арганізацый. Яны прымалі дзейсныя меры па ажыццяўленні кантролю за выкананнем калектыўных дагавораў. Адзначаючы важную ролю калектыўных дагавораў у рабоце прафсаюзаў, XVI пленум УсеЦСПС (1949 г.) падкрэсліў, што калектыўны дагавор, які ахоплівае ўсе бакі вытворчага жыцця прадпрыемства, пытанні працы і быту рабочых і служачых, павінен на справе стаць асновай усёй прафсаюзнай работы на прадпрыемстве. Пытанні калектыўна-дагаворнай працы разглядаліся на пленумах і пасяджэннях прэзідыумаў прафсаюзных органаў. Так, у ліпені 1950 г. пленум Белсаўпрафа заслухаў і абмеркаваў даклад старшыні Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза мясцовай прамысловасці «Аб ходзе выканання калектыўных дагавораў у 1950 г. на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці Беларусі» [10, с. 334].

У сярэдзіне 1950-х гг., асабліва пасля XX з’езда КПСС (люты 1956 г.), адбываецца некаторая дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця краіны, пачынаецца перыяд «адлігі». Гэта станоўча адбіваецца на калектыўна-дагаворнай рабоце. Рабочыя сходы, якія адбыліся восенню 1957 г. па ўсёй Беларусі і абмеркавалі вынікі праверкі выканання калектыўных дагавораў, прыцягнулі шырокія слаі працоўных. Свае заўвагі, парады і прапановы на сходах выказалі больш за 13 тыс. рабочых і служачых [12].

Выконваючы пастанову снежаньскага (1957 г.) Пленума ЦК КПСС «Аб рабоце прафесійных саюзаў» [13, с. 301–305], прафсаюзныя камітэты пачалі дзейнічаць больш энергічна, дамагаліся ад адміністрацыі прадпрыемстваў выканання патрабаванняў працоўных. Гаспадарчыя кіраўнікі з большай адказнасцю ставіліся да выканання дагаворных абавязацельстваў. У выніку значна ўзрасла колькасць прадпрыемстваў, дзе своечасова ажыццяўляліся ўсе абавязацельствы па калектыўным дагаворы.

Актыўнаму ўдзелу працоўных у вырашэнні сацыяльных пытанняў садзейнічала і пастанова снежаньскага (1957 г.) Пленума ЦК КПСС аб мэтазгоднасці ператварыць вытворчыя нарады, якія з’явіліся ў пачатку 1920-х гг., у пастаянна дзеючыя органы працоўных. 9 ліпеня

1958 г. Савет Міністраў СССР і УсеЦСПС зацвердзілі «Палажэнне аб пастаянна дзеючай вытворчай нарадзе на прамысловым прадпрыемстве, будоўлі, у саўгасе, МТС і РТС», якое вызначыла змест, парадак працы і правы вытворчай нарады [14]. Пастаянна дзеючыя вытворчыя нарады (ПДВН) ствараліся на дзяржаўных прадпрыемствах, будоўлях і ў цэхах прадпрыемстваў з колькасцю працуючых сто і больш чалавек. Яны былі надзелены больш шырокімі паўнамоцтвамі, атрымалі права заслухоўваць кіраўнікоў прадпрыемстваў па ўсіх пытаннях гаспадарчай дзейнасці, уносіць прапановы, накіраваныя на паляпшэнне арганізацыі працы прадпрыемстваў, рабіць крытычныя заўвагі аб рабоце асобных гаспадарнікаў і г. д.

Рабочыя прадпрыемстваў і будоўляў БССР прымалі актыўны ўдзел у дзейнасці вытворчых нарад. Ужо ў 1958 г. удзельнікі ПДВН унеслі больш за 55 тыс. прапаноў, накіраваных на паляпшэнне вытворчасці, арганізацыі працы, скарачэнне і ўдасканальванне адміністрацыйна-кіраўніцкага апарату. Больш за 30 тыс. прапаноў былі рэалізаваны. Добра працавалі ПДВН на мінскіх аўтамабільным, трактарным, падшыпнікавым заводах, Віцебскай фабрыцы «КІМ» і іншых прадпрыемствах [11, арк. 155, 156]. Колькасць ПДВН расла. Калі ў пачатку 1959 г. на прадпрыемствах, будоўлях, у саўгасах рэспублікі налічвалася 2650 ПДВН, у рабоце якіх прымала ўдзел больш за 110 тыс. чалавек, то ў 1968 г. працавала 3335 агульназаводскіх (149 832 удзельнікаў) і 1319 цэхавых нарад (39 958 удзельнікаў) [15, с. 226].

Дзейнасць ПДВН ажыццяўлялася ў цеснай сувязі з калектыўна-дагаворнай працай. 28 верасня 1961 г. у Белсаўпрафе адбылася нарада старшыняў ФЗМК і ПДВН групы прадпрыемстваў г. Мінска і загадчыкаў аддзеламі працы і зарплаты рэспубліканскіх камітэтаў прафсаюзаў па пытанні аб мерах паляпшэння практыкі заключэння калектыўных дагавораў і працы вытворчых нарад з удзелам прадстаўніка УсеЦСПС. Усе цікавыя прапановы ўдзельнікаў нарады былі потым перададзены ў прафсаюзны орган краіны [16]. У гэты перыяд на прадпрыемствах прамысловасці, будаўніцтва, у саўгасах БССР штогод заключалася звыш 1850 калектыўных дагавораў [15, с. 231].

Заслугоўвае ўвагі станоўчы факт заключэння, пачынаючы з 1959 г., акрамя калектыўных дагавораў, пагадненняў паміж упраўленнямі Саўнаргаса (СНГБ), міністэрствамі і ведамствамі БССР і рэспубліканскімі камітэтамі прафсаюзаў. У іх прадугледжваліся меры дапамогі прадпрыемствам па заключэнні калектыўных дагавораў, развіцці спаборніцтва, укараненні перадавога вопыту, паляпшэнні ўмоў працы працуючых. У 1959 г. было заключана 21 такое пагадненне [17, арк. 316]. Гэтая практыка працягвалася і ў наступныя гады. У шэрагу выпадкаў прынятыя дакументы называліся Генеральным пагадненнем (напрыклад, паміж Упраўленнем будаўнічых матэрыялаў СНГБ і рэспубліканскім камітэтам прафсаюза рабочых будаўніцтва і прамбудматэрыялаў, Упраўленнем тарфяной прамысловасці і Беларускім рэспубліканскім камітэтам (БРК) прафсаюза рабочых электрастанцый і электрапрамысловасці). У іншых выпадках – Пагадненнем па стварэнні ўмоў для выканання калектыўных дагавораў (у тэкстыльнай і лёгкай прамысловасці на 1963 г.) ці проста як «Пагадненне начальніка Галоўнага упраўлення выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю і БРК прафсаюза работнікаў культуры на 1963 г.» [18, арк. 241, 266].

Аднак у калектыўна-дагаворнай рабоце было шмат фармалізму. Так, згодна з зацверджаным Палажэннем, калектыўны дагавор павінен быў заключацца ў пачатку года, а адміністрацыя прадпрыемства з мэтай давядзення зместу да кожнага работніка павінна была на працягу аднаго месяца размножыць дагавор у тыпаграфіі і вывесіць на бачных месцах у цэхах. Аднак, як адзначалася ў запісцы ад 31 кастрычніка 1961 г. начальніка Галоўліта БССР Л. В. Садоўскага на імя сакратара ЦК КПБ П. М. Машэрава, было нямала выпадкаў, калі калектыўныя дагаворы дастаўляліся ў тыпаграфію толькі ў чэрвені ці нават у ліпені-жніўні. Напрыклад, калектыўны дагавор завода зборнага жалезабетону № 3 трэста «Будіндустрыя» на 1961 г. быў надрукаваны толькі 18 кастрычніка 1961 г. Такое позняе размнажэнне калектыўнага дагавора на 1961 г. губляла сэнс і прыводзіла толькі да непатрэбных трат дзяржаўных сродкаў [18, арк. 253–255]. Запіска была разгледжана ў партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых органах і прыняты меры па выпраўленні сітуацыі. У пастанове Прэзідыума Белсаўпрафа ад 1 снежня 1961 г. «Аб заключэнні калектыўных дагавораў на 1962 г.» і пастанове Калегіі Саўнаргаса ад 14 снежня з'явіўся пункт: «Устанавіць, што зарэгістраваны калектыўны дагавор павінен быць размножаны адміністрацыяй прадпрыемства не пазней чым праз месяц пасля яго падпісання [19, арк. 273, 278].

Калектыўныя дагаворы заключаліся на прадпрыемствах дзяржаўнай формы ўласнасці. Разам з тым, са з'яўленнем увосень 1964 г. прафарганізацый у калгасах па распачынанні прафсаюзнага камітэта калгаса «Кастрычнік» Гродзенскага раёна паміж прафкамамі і праўленнямі калгасаў пачалі заключацца штогадовыя пагадненні па сацыяльных пытаннях і ахове працы [20, с. 256].

Да сярэдзіны 1960-х гг. калектыўныя дагаворы мелі месца толькі на прадпрыемствах з колькасцю працуючых не менш 100 чалавек.

Аднак, пачынаючы з 1966 г., яны пачалі заключацца на прадпрыемствах, якія мелі самастойны баланс і з'яўляліся юрыдычнай асобай, незалежна ад колькасці працуючых. Эканамічная рэформа А. М. Касыгіна, якая пачалася ў СССР у адпаведнасці з рашэннямі вераснёўскага (1965 г.) пленума ЦК КПСС, і пашырэнне правоў прадпрыемстваў дазволілі ўзмацніць ролю калектыўных дагавораў. Была зроблена спроба актывізаваць перамоўны працэс у сферы працоўных адносін. Пастанова Савета Міністраў СССР і УсеЦСПС ад 6 сакавіка 1966 г. «Аб заключэнні калектыўных дагавораў на прадпрыемствах» пашырыла правы адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта ў пытаннях рэгулявання працы, фарміраванні зместу калектыўнага дагавора. Аднаўляўся нарматыўна-прававы статус калдагавораў [21]. Прэзідыум УсеЦСПС і Дзяржкампрацы СССР у 1966 г. падрыхтавалі сумеснае «Палажэнне аб парадку заключэння калдагавораў» [22, с. 21–24]. У ім вызначаўся парадак падпісання дагавораў, іх структура і змест, умовы прымянення і кантролю.

Белсаўпраф, абласныя саўпрафы, рэспубліканскія і абласныя камітэты прафсаюзаў, пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі ажыццяўлялі сістэматычны кантроль за выкананнем узятых адміністрацыяй абавязацельстваў. Арганізоўваліся масавыя праверкі выканання зместу калдагавораў за паўгоддзе і за год. Так, на Полацкім заводзе шкловалакна ў 12 сходах па выніках праверкі выканання абавязацельстваў па калектыўным дагаворы за 1967 г. прынялі ўдзел 4620 чалавек з 5255, ахопленых калдагаворам (87,9 %), прычым 64 з 67 унесеных у дагавор двухбаковых абавязацельстваў былі выкананы [15, с. 231, 232].

Аднак і ў другой палове 1960-х гг. рэгуляванне ўмоў працы і заработнай платы на мясцовым узроўні допушчалася толькі ў вузкіх рамках, змест калектыўнага дагавора паранейшаму знаходзіўся пад кантролем зверху, працягвалася практыка дырэктыўных пісем, якія ўтрымлівалі нарматыўныя паказчыкі. А з канца 1960-х гг. эканамічная рэформа ў СССР пачала згортвацца (паўплывалі падзеі «пражскай вясны» ў Чэхаславакіі, дзе ў 1968 г. спроба ўкараніць «рыначны сацыялізм з чалавечым тварам» прывяла да антыкамуністычных настрояў сярод часткі насельніцтва і мела наступствам увод войскаў пяці краін Варшаўскага Дагавору).

*Заключэнне.* Такім чынам, аднаўленне ў другой палове 1940-х гг. і далейшае развіццё ў 1950–1960-х гг. калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін мела важнае значэнне для вырашэння сацыяльных пытанняў, павышэння актыўнасці працоўных мас і ролі прафсаюзаў, садзейнічала паляпшэнню ўмоў працы рабочых і служачых. Аднак у калектыўна-дагаворнай рабоце было шмат хібаў. Калектыўныя дагаворы з'яўляліся фармальным дакументам, іх дагаворная сутнасць і рэгулятыўнае значэнне ў сферы працоўных адносін, характэрныя для перыяду НЭПа, былі страчаны. Спробы ажывіць калектыўна-дагаворную справу прымаліся ў час касыгінскай эканамічнай рэформы сярэдзіны 1960-х гг., калі быў адноўлены нарматыўна-прававы статус калдагавораў.

Аднак калектыўна-дагаворная практыка ў СССР мела шэраг асаблівасцей. Перш за ўсё, працаўнікі і наймальнікі выступалі не як бакі сацыяльнага партнёрства са сваімі інтарэсамі, а як прадстаўнікі аднаго калектыву, якія вырашалі аднолькавыя задачы. Па сутнасці калектыўны дагавор уяўляў сабой план сумесных дзеянняў адміністрацыі і прафкама па паляпшэнні ўмоў і ахове працы, рашэнні іншых сацыяльна-бытавых пытанняў на прадпрыемстве. Можна пагадзіцца з расійскім даследчыкам А. В. Шчарбаковым, які адзначае, што ў краіне сістэма сацыяльнага партнёрства ў традыцыйным яго разуменні з'явілася толькі ў пачатку 90-х гг. XX ст.: «Ні дарэвалюцыйны, ні савецкі перыяды не ведалі сацыяльнага партнёрства як новага тыпу грамадскіх адносін, хоць пэўны ўзровень рэгулявання асобных аспектаў сацыяльна-працоўных адносін у пазначанай галіне меў месца» [23, с. 133]. Разам з тым, пэўны вопыт калектыўна-дагаворнага рэгулявання працоўных адносін, назапашаны ў даследуемы перыяд, можа быць выкарыстаны ў сучаснай практыцы развіцця сацыяльнага партнёрства.


*Літаратура і крыніцы*

1. *Дубовік, А. А.* Дзейнасць прафсаюзаў Беларусі па калектыўна-дагаворным рэгуляванні працоўных адносін у перыяд НЭПа / А. А. Дубовік // Весці Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2015. – № 4. – С. 36–42.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 265. Воп. 1. Спр. 3575.
3. *Урсалова, О. В.* Из истории правового регулирования коллективных договоров в России / О. В. Урсалова // Правоведение. – 2002. – № 3. – С. 217–228.

*References*

1. *Dubovik, A. A.* Dzjejnasc» prafsajuzaw Bjelarusi pa kaljektywna-dagavornym regulJavanni pracownyh adnosin u pjeryJad NEPa / A. A. Dubovik // Vjesci Bjelarus. dzJarzh. pjed. un-ta. Sjer. 2, GistoryJa. FilasofiJa. PalitalogiJa. SacyJalogiJa. Ekanomika. Kul»turalogiJa. – 2015. – № 4. – S. 36–42.
2. NacyJanal»ny arhiw Respubliki Bjelarus» (NARB). – F. 265. Vop. 1. Spr. 3575.
3. *Ursalova, O. V.* Iz istorii pravovogo regulirovaniya kollektivnyh dogovorov v Rossii / O. V. Ursalova // Pravovedenie. – 2002. – № 3. – S. 217–228.

4. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам : сб. док. за 50 лет : в 5 т. – М. : Политиздат, 1968. – Т. 3. 1941–1952 годы. – 751 с.
5. Устав профессиональных союзов СССР. – М. : Профиздат,1949. – 40 с.
6. *Михайлов, А. М.* Профсоюзы Белоруссии в борьбе за выполнение четвертой пятилетки в области промышленности / А. М. Михайлов. – Минск, 1961. – 131 с.
7. *Потемкин, В. К.* Социальное партнерство: формирование, оценка, регулирование / В. К. Потемкин, Д. Н. Казаков. – СПб. : РАЕН, 2002. – 202 с.
8. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 29. Спр. 696.
9. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 6. Спр. 7.
10. Очерки истории профсоюзов Белоруссии (1905–1969 гг.) – Минск : Беларусь, 1970. – 474 с.
11. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 5. Спр.141.
12. *Бельский, И.* В ногу с жизнью / И. Бельский // Труд. – 1957. – 25 октября.
13. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и Пленумов ЦК : в 14 т. / Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – 8-е изд., доп. – М. : Политиздат, 1970–1982. – Т. 7: 1955–1959. – М., 1971. – 558 с.
14. Собрание постановлений Правительства СССР. – 1958. – № 13. – Ст. 101.
15. История профсоюзного движения Беларуси / П. Г. Давидюк [и др.] ; под ред. Л. П. Козика. – Минск : ФУАинформ, 2005.– 416 с.
16. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 7. Спр. 300.
17. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 7. Спр. 219.
18. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 9. Спр. 375.
19. НАРБ. – Ф. 265. Воп. 7. Спр. 305.
20. *Дубовик, А. К.* Возрастание роли профсоюзных организаций в жизни колхозной деревни (по материалам Белорусской ССР) / А. К. Дубовик // Проблемы истории советского крестьянства : сб. ст. / Акад. наук СССР, Ин-т истории ; редкол.: М. П. Ким [и др.]. – М. : Наука, 1981. – С. 251–261.
21. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. – М., 1968. – Т. 6. – С. 27–30.
22. Сборник постановлений ВЦСПС. Октябрь – декабрь 1966. – М. : Профиздат, 1967. – 96 с.
23. *Щербаков, А. В.* Система социального партнерства: история, современность и перспектива / А. В. Щербаков // Право и государство: теория и практика. – 2010. – № 4. – 133–138.

4. Resheniya partii i pravitel'stva po hozyajstvennym voprosam : sb. dok. za 50 let : v 5 t. – M. : Politizdat, 1968. – T. 3. 1941–1952 gody. – 751 s.
5. Ustav professional'nyh soyuzov SSSR. – M. : Profizdat,1949. – 40 s.
6. *Mihajlov, A. M.* Profsoyuzy Belorussii v bor'be za vypolnenie chetvertoj pyatiletki v oblasti promyshlennosti / A. M. Mihajlov. – Minsk, 1961. – 131 s.
7. *Potemkin, V. K.* Social'noe partnerstvo: formirovanie, ocenka, regulirovanie / V. K. Potemkin, D. N. Kazakov. – SPb. : RAEN, 2002. – 202 s.
8. NARB. – F. 4p. Vop. 29. Spr. 696.
9. NARB. – F. 265. Vop. 6. Spr. 7.
10. Ocherki istorii profsoyuzov Belorussii (1905–1969 gg.) – Minsk : Belarus', 1970. – 474 s.
11. NARB. – F. 265. Vop. 5. Spr.141.
12. Bel'skij, I. V nogu s zhizn'yu / I. Bel'skij // Trud. – 1957. – 25 oktyabrya.
13. Kommunisticheskaya partiya Sovetskogo Soyuza v rezolyuciyah i resheniyah s»ezdov, konferencij i Plenumov CK : v 14 t. / In-t marksizma-leninizma pri CK KPSS. – 8-e izd., dop. – M. : Politizdat, 1970–1982. – T. 7: 1955–1959. – M., 1971. – 558 s.
14. Sobranie postanovlenij Pravitel'stva SSSR. – 1958. – № 13. – St. 101.
15. Istoriya profsoyuznogo dvizheniya Belarusi / P. G. Davidyuk [i dr.] ; pod red. L. P. Kozika. – Minsk : FUAinform, 2005.– 416 s.
16. NARB. – F. 265. Vop. 7. Spr. 300.
17. NARB. – F. 265. Vop. 7. Spr. 219.
18. NARB. – F. 265. Vop. 9. Spr. 375.
19. NARB. – F. 265. Vop. 7. Spr. 305.
20. *Dubovik, A. K.* Vozrastanie roli profsoyuznyh organizacij v zhizni kolhoznoj derevni (po materialam Belorusskoj SSR) / A. K. Dubovik // Problemy istorii sovetskogo krest'yanstva : sb. st. / Akad. nauk SSSR, In-t istorii ; redkol.: M. P. Kim [i dr.]. – M. : Nauka, 1981. – S. 251–261.
21. Resheniya partii i pravitel'stva po hozyajstvennym voprosam. – M., 1968. – T. 6. – S. 27–30.
22. Sbornik postanovlenij VCSPS. Oktyabr' – dekabr' 1966. – M. : Profizdat, 1967. – 96 s.
23. *Shcherbakov, A. V.* Sistema social'nogo partnerstva: istoriya, sovremennost' i perspektiva / A. V. Shcherbakov // Pravo i gosudarstvo: teoriya i praktika. – 2010. – № 4. – 133–138.